ББК 86
Мал 18

**Маліноўскі Яўген**

Парусія: псіхалогія прысутнасці. — Баранавічы : Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны", 2007. — 260 с., іл.

ББК 86

© Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларускай мовы
імя Францішка Скарыны" 2007
© Афармленне Уладзімір Гундар

# Прыйсьці да сваёй веры

## Прадмова

Шаноўнае спадарства! Вы трымаеце ў руках кнігу баранавіцкага грэка-каталіцкага сьвятара айца Яўгена Маліноўскага "Парусія: псыхалёгія прысутнасьці". Артыкулы з гэтае кнігі пэўны час друкаваліся на старонках мясцовай газэты Intex-press і мелі вялікі водгук у грамадзтве. Сябры і прыхільнікі уніяцкай парафіі вырашылі сабраць ў адзінае цэлае, як напісанае настаяцелем баранавіцкага прыходу св. Кірылы і Мятода Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы, надрукаваць суцэльнай кнігай.

У мінулым стагоддзі ўніяцкі сьвятар Леў Гарошка, які ў гады Другой сусьветнай вайны кіраваў у Баранавічах медычнай школай, напісаў кнігу "Навука і рэлігія". Аўтар абвяргаў савецкія тэзісы аб шкоднасьці рэлігіі, нясумяшчальнасьці веры ў Бога і навукі, пераканаўча даказваў, што найбольшыя вучоныя ў аграмаднай большасьці былі веруючымі людзьмі. Традыцыі архімандрыта Льва Гарошкі жывуць і працягваюцца сёньняшнімі ягонымі пасьцежнікамі.

Кніга айца Яўгена Маліноўскага "Парусія: псыхалёгія прысутнасьці" – гэта першы вопыт псыхалягічнага абагульненьня рэлігійнай і палітычнай практыкі. Хацеў бы адзначыць, што гэтую тэму сучасныя навукоўцы і сьвятары дэлікатна абыходзяць, "пераканаўча" спасылаючыся, што сапраўдная рэлігія па-за палітыкай. Пэўна яно так і ёсьць у дэмакратычным грамадзтве, але не ў нас. Трэба прызнаць мужнасьць уніяцкага сьвятара, які ў сваіх разважаньнях пра Бога і існасьць спалучае рэлігію і палітыку, псыхалёгію і мастацтва. Праўда, айца Яўгена цікавіць не столькі сама палітыка, як правая свабода. І калі палітыка перашкаджае свабодзе, то трэба аб гэтам смела казаць. Але на такі крок сёньня здольны не кожны чалавек.

Беларуская дзяржава *Вялікае княства Літоўскае* было прававой дзяржавай, у якой панавала воля і талерантнасьць. Прыгонныя сяляне і стараверы сотнямі тысячаў беглі сюды з Расеі ад дэспатызму. Перасьледаваныя на радзіме ардынс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II.17. Выбары .................. 78
II.18. Палітыка .................. 81
II.19. Жэрабя кінута .................. 85
II.20. Пост .................. 88
II.21. Пасха .................. 91
II.22. Духоўнасць .................. 93
II.23. Хараство .................. 96
II.24. Быць .................. 99
II.25. Тройца .................. 102
II.26. Слава .................. 105
II.27. Храм .................. 108
II.28. Лішак .................. 111
II.29. "Не хочу иметь ребенка..." .................. 116
II. 30. Радаснае ганенне .................. 117
II.31. Вавілонская вежа тэлерэчаіснасці .................. 123
II.32. Час асабістай прысутнасці .................. 127
II.33. Выбранасць .................. 131
II.34. Ад сектанцтва да еднасці .................. 134

III
ЭКЗІСТЭНЦЫЯ ВЫХАВАННЯ .................. 137
III.1. Успенне .................. 138
III.2. Акмеалагічная перспектыва ўзросту .................. 142
III.3. Гэапсіхалагічная канфесійнасць асобы .................. 150
III.4. Сямейная трапеза экумены .................. 153
III.5. Прафесія маці .................. 156
III.6. Прафесія: айцец .................. 160
III.7. Сямейная парусія: "Сем хлябоў і дзве рыбы" .................. 164
III.8. Вяртанне да сябе .................. 169
III.9. Інтралог .................. 172
III.10. У сям'і не без нарцыса .................. 176
III.11. Любоў не раздражняецца .................. 180
III.12. Ружанец у псіхічным развіцці дзіцяці .................. 183
III.13. "Лебядзінае паляванне" .................. 188
III.14. Містыка .................. 189
III.15. Алтарна-педагагічныя разважанні .................. 192
III.16. Педагагічныя прынцыпы асабістай свабоды .................. 196

IV
ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРОПАВЕДЗЬ .................. 203
IV.1. Псіхагістарычны сэнс Евангелля .................. 204
IV.2. Час казання .................. 206
IV.3. Вызваленне спаралізаванага .................. 208
IV.4. "Хай будуць усе адно" .................. 210
IV.5. Суд Божы .................. 215
IV.6. Цуд Божы .................. 218
IV.7. Навігацыя .................. 221
IV.8. Экзарцызм, альбо выгнанне дэманаў .................. 224
IV.9. Перамяненне Гасподняе .................. 226
IV.10. Pietas – Шанаванне .................. 228
IV.11. Не судзі .................. 230
IV.12. Багацце ад Бога .................. 232
IV.13. "Камень, адкінуты будаўнікамі" .................. 234
IV.14. Падвышэнне Пачэснага і Жыццядайнага Крыжа .................. 236
IV.15. Казанне на свята Андрэя Першапаклікананага .................. 240
IV.16. Шлюбная вячэра .................. 243
IV.17. Старое віно і новая ахвяра .................. 245

POST-PARTOR* – СПАДКАЕМЦА .................. 249

ГЛАСАРЫЙ .................. 251

ЛІТАРАТУРА .................. 253

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# III.15. Алтарна-педагагічныя разважанні

Падкрэсліваючы неабходнасць канфесійных зносін у сямейна-педагагічным асяродку, здалося цікавым адшукаць антонім слову “застолле”. І вось “Прастолле” як нейкая неалагічная індукцыя як быццам змяшчае ў сабе пэўныя дыскурсна-выхаваўчыя высновы.

Ёсць у М. Бахціна, а затым у М. Бубера канцэпцыя філагенэтычнага абнаўлення народаў праз сталую парусію схемы: “дыялог – карнавал – хранатоп”, характарызуючыя этапы ўзыходжання, трыумфавання і падзення. Усякая схема, і перадусім схема крыжа, навуковая, таму прыдатная да розных сфер богачалавечай паўсюдна-прысутнасці. Евангелле, вядомае артаганальным пачаткам “голасу лямантуючага на пустыні”, вылучае канфесійны дыялог Нагорнай пропаведзі, які пераходзіць да авацый карнавальнага шэсця Госпада ў Ерусалім, а затым праз Гефсіманскую малітву да Хранатопу чалавечай гісторыі як метастазы Галгофы. Галгофскае прастолле, уцісне з усіх бакоў ліхога свету, марудна, але настойліва сегрэгуе народ, які прагне сустрэчы з Творцам. З кожным пражытым годам гэтая сегрэгацыя, альбо падзяленне на авечак і казлоў, набірае жыццёвую моц Сада, альбо, з санскрыцкага, “рая”, які ўрэшце забяспечвае свабоду ад карнавальных масак, сарваных Галгофай з чалавека для его сапраўды творчага, а таму зусім недэманстратыўнага, непаказнога шчасця.

Альтэрнатывай прастоллю ёсць застолле як “пір падчас чумы”, гэты эйфарычна-групавы застой падчас “уцёкаў ад сябе” (Э. Фромм). Прастолле – таксама групавое адчуванне, але, як артаганальнае “чумнаму піру”, яно натхняе кожнага члена групы на дасягненне Ізраіля як лучнасці тых, што “маюць вухі, каб чуць” [Мц 11, 15], на шляху да шчасця.

“Такім чынам, за кошт “застолля” і “прастолля” адбываецца агульная сегрэгацыя, падзел гэтага свету на “авечак” і “казлоў” [Мц 25, 32] у іх індывідуальнай адпаведнасці праўдзе і хлусні. Правіцель лагера “казлоў” – Сатана, струхлелы Змей, які некалі зводзіў сыноў Ёва шматпакутнага застольнымі стравамі [Ёў 1, 4], папіраючы і сучасны свет келіхамі страўнікаўгоддзя і распусты. Галгофа як axios, вось сусвету касуе дуалізм цемры і святла ў “прастоллі” сціплай Эўхарыстыі як



ціхай размовы з Ісусам: “Усё маё жыццё – гэта некалькі радкоў ціхай малітвы перад прычасцем” (з Тэзэ).

Падчас гэтай размовы з Ісусам немагчыма ўскласці локці на алтар альбо прастол. Складаючы гэты тэкст, я выпадкова напісаў імя Госпада з малой літары, але кампутар у той жа міг выправіў памылку. Дэманструючы кампетэнцыю хрысціянскай цывілізацыі, усцешыўшыся мяжэ новым часам вольнасці. Бо яшчэ 20 год таму аб такім выпраўленні немагчыма было нават і марыць.

Такая дэталь выявіла ранае этычны кампанент прастолля як “неаблокавальная”. На фоне жорсткіх правіл храмавай артадоксіі Хрысціянская Царква сегрэгуе прынцыповыя этыка-эстэтычныя ўмовы духоўнасці, якія, з аднаго боку, спрыяюць “адкрыццю дасведчаных” [1 Кар 11, 19], з другога боку, выяўленню хамаватых, не сензітыўных, не адчувальных алтару, прастоллю. Менавіта этыка-эстэтычны прынцып кіраваў Гедэонам пры сегрэгацыі, аддзяленні мужоў-ваяроў, ніўшых ваду з далоні, аж з 10 тысяч ізраільцянаў, “хлябтаўшых языком сваім, як псіна” [Судз 7, 4].

Адчуванне перад табернакулюмам (дарахавальніцай) і прастолам, алтарам – глыбока асабістая справа, але падобную асабістую рэфлексію адзначае кардынал Х.У. Бальтазар пры разважанні аб чацвёртай іпастасі Бога – харастве: “Адным з шляхоў да Бога служыць здольнасць успрымаць прыгажосць і веліч: зразумець можа толькі той, хто здольны да здзіўлення” [48, с. 191]. Нават апанент хрысціянства Ф. Ніцшэ вымушаны быў сам сабе супярэчыць у прызнанні таго факта, што толькі ў царкоўным асяродку маглі развіцца найбольш тонкія, эстэтычна ўзвышаныя твары.

Глабалізацыя сацыяльна-эканамічнай рэчаіснасці, так званы zeit geist, альбо “дух часу”, утварае дадатковыя перашкоды этыка-эстэтычнаму развіццю асобы. Так, рэўнасна прастольны кірунак думак узнікае пры надакучлівым сузіранні джынсаў на юнай лектарцы з распушчанымі валасамі ў малітоўным сходзе. Адна вельмі здольная, але не вельмі выхаваная дзяўчынка-падлетак “ничтоже сумняшеся” ўсклала локці на касцельны алтар як на куханны стол. Пры шматлюдным наплыве людзей сітуацыя засталася нікім не заўважанай, нават самой дзяўчынкай. Я ж сам сабе памысліў: у праваслаўным храме не тое што ўскласці локці на прастол, але нават увайсці у прасбітэрыум жанчыне забаронена. Магчыма, некаторым вернікам карысна было б выкананне падобнага правіла, каб зусім не адпасці ад “прастолля”.



РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

Нявыхаванасць дзіцяці ў адносінах да алтара ёсць насамрэч наступства "застолля", абыякавага да дзяцей. У застольным гомане дзяцей ігнаруюць. У лепшым выпадку, як за велізарным застоллем "Поля чудес", так і за доўгім сталом Навагодняга карнавалу, іх прымушаюць дэманстраваць свае артыстычныя здольнасці. Такім карнавальным спосабам развіваецца прывучаны дэманстратызм дзіцяці як спосаб адаптацыі да сусвету праз ігнараванне этыка-эстэтычных тонкасцяў. "Любить так любить, – заўзята лямантуе вядомы бард, – гулять так гулять, стрелять так стрелять!".

Сітуацыя "застолля" назіраецца не толькі за харчавальным сталом, але і, напрыклад, за доўгім сталом педсавета. Падчас такога застолля самога дзіцяці ніколі не слухаюць, толькі культывуюць яго матэматычныя, лінгвістычныя, матэрыяльна-эканамічныя ды іншыя "бойцовские качества", прывабныя хуткай дасягальнасцю поспеху, які перакрывае сваёй дынамікай нябачнае адчуванне шчасця.

Аднойчы ва універсітэце праходзіла міжнародная навуковая канферэнцыя, распачатая выступленнем ансамбля старадаўняй музыкі "Кантраданс", стаўшага замест дзейснага кантрапункту разважанняў наконт метадычных матываў канферэнцыі, не кантэмплятыўна-паліравальным прэзентам. Сумна-іранічным настроем было адмечана выступленне таго ж ансамбля падчас прастольнага свята касцельнага прыходу, дзе карнавальнае буйства электраўзмацняльнікаў заціскала ціхія гукі Мантэвердзі і Альбіноні.

"Музыку жалко" – гэтыя развітальныя словы Л. Талстога сталі шмат у чым эпіграфічнай спадчынай дынамічна-тэхналагічнай эпохі "застолля". Сіндром "застолля" нясе з сабой загана-ліцадзейскія акцэнтуацыі: узбуджальнасць, захрасанне на ўласных эмоцыях, пакрыўджанасць, прымхлівасць, экзальтацыя, цыклічная зменлівасць настрою, залежнасць ад вонкавых, бліскучых бакоў жыцця і смерці.

На фоне карнавальнай эйфарыі "прастолле" застаецца, насамрэч, адзіным выхаваўчым метадам, які ўключае тры састаўляючыя элемента. Першы – лагічны, той, што засяроджвае мэту выхавання верніка Маці-Царквой: "жанчына, апранутая ў сонца" нараджае "Немаўляці мужчынскага роду.., узнесенага да Бога і прастолу Яго" [Адкр 12].

Другі элемент, гістарычны, – эўхарыстыя, альбо святое прычасце, эсхаталагічная няспыннасць якога ад непаразумення і метафізічнага заснавання – "Як Ён можа даць нам есці сваю плоць?" [Ян 6, 52] – сягае да стварэння прастольнай рэальнасці Неба на Зямлі: "Прастол Яго на небе, вочы Яго глядзяць на ўбогага" [Пс 11, 4].

Трэці элемент – педагагічны, той, што непасрэдна праектуе "самы вобраз рэчаў" праз закон як цень будучых даброт" [Габ 10, 1]. Гэты элемент здзяйсняецца таксама "прастольным" спосабам, бо педагагічны Савет, лакальна-кан'юктурны сэнс якога пераадольвецца парусіяй, прысутнасцю на ім Старшыні – "дзіцяці Саветнага... на прастоле Давіда ў Валадарстве Яго" [Іс 9, 6-7]. Такое старшынства пераўтварае звычайную сямейную вячэру ў рэлігійную трапезу "ламання хлеба", малітоўны пачатак і канец якога засяроджаны на ўспаміне і чаканні піру Парусіі.

Са старадаўніх часін чалавек прызнаваў свяшчэнны сэнс ежы і пітва, даруемых па шчодрасці Бога, падацеля хлеба, віна, вады, пладоў... Сама трапеза заўжды мела чын свяшчэнных сувязей сям'і і Бога. Усё самае значнае ў жыцці вырашалася і адзначалася за сямейным сталом. Сам стол асацыюецца ў сакральнай свядомасці з годнасцю сямейнага сходу альбо савету. Веліч прастолу як месца старэйшыны роду аксіялагізуецца яго мудрасцю.

Такая засяроджанасць мудрасці накіроўвае творчую моц сямейнага савета, надае значэнне кожнаму прамоўленаму за сталом слову, у тым ліку, слову дзіцяці, да якога прыслухоўваюцца дарослыя, бо "вуснамі немаўляці прамаўляе праўда". У дадзенай сувязі нагадалася сямейная гісторыя. Вераснёўская трапеза ў семь'ях настаўнікаў бывае, звычайна, сціплаю. У адзначаныперыяд гэтая сціпласць яшчэ больш узмоцнілася настроем навісаючай гароты. Пасля засяроджанага маўчання за сталом я параіўся з дзецьмі: прасіць пазыкі ў людзей альбо чакаць. Дзеці дружна адказалі: «Будзем маліцца!» Усе прыкметна павесялелі. Раптоўна данёсся мілагучны звон тэлефона, які абвясціў нас аб нечаканай дапамозе. Падобных гісторый можна было б прывесці тысячу. Але кожны вернік мае іх прыблізна такую ж колькасць!

Так Усемагутны Міласэрны Бог даводзіць сваіх выхаванцаў – дзяцей і дарослых да цвярозага прыстанішча і ціхага "прастолачування" навучальным выпрабаваннем. У ім звычайны стол можа перамяніцца ў прастол, за якім жыццёвыя сітуацыі сталюющца ў Божы провід, адзначаны ў трох этапах: Бог выхоўвае Свой народ, народ выхоўвае сям'ю, сям'я выхоўвае свабодную асобу.





РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ